

Тыдзень роднай мовы

# МОЎНЫ МАРАФОН

**З 13 па 21 лютага ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праходзіць Тыдзень роднай мовы. Традыцыйна вучоныя Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі рыхтуюць шэраг мерапрыемстваў, на якія запрашаюць школьнікаў, студэнтаў, прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў**

Моўны марафон стартаваў з шэрагу сустрэч у Віцебску **13–14 лютага**. Вучоныя наведалі Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава, дзе расказалі студэнтам і выкладчыкам пра асноўныя навуковыя напрамкі дзейнасці Інстытута мовазнаўства. Тут прадставілі і сапраўдны кніжны хіт – выданне «Беларуская мова ад А да Я». На яго старонках у папулярнай форме расказваецца пра галоўныя падзеі ў гісторыі развіцця нацыянальнай мовы, яе адметныя рысы, знакавыя пісьмовыя помнікі і сучасныя слоўнікавыя выданні. Прыводзяцца цікавыя моўныя факты, выказванні паэтаў і пісьменнікаў пра роднае слова, прыказкі, якія адлюстроўваюць каларыт беларускай мовы.

Мовазнаўцы завіталі і ў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, дзе выступілі з лекцыяй «Фарміраванне моўнай кампетэнцыі будучых урачоў ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму Беларусі». Падчас сустрэчы вучоныя расказалі пра гісторыю фарміравання нацыянальнай медыцынскай тэрміналогіі, праблемы яе ўнармавання і функцыянавання ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

Да агульнай справы падключацца і літаратуразнаўцы, якія правядуць шэраг сустрэч у сталічных школах. У аўторак **18 лютага** запланавана Міжнародная навуковая канферэнцыя «Нацыянальныя літаратуры ў эпоху глабалізацыі: тэорыя, практыка адаптацыйных працэсаў, вынікі». Тут абмяркуюць творчую спадчыну народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі ў літаратурным працэсе XX–XXI стст., падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў літаратурна-мастацкім асэнсаванні; нацыяахоўны патэнцыял літаратурнай класікі. кірункі і перспектывы даследавання; жанрава-стылёвыя пошукі беларускай літаратуры XX–XXI стст.

У цэнтры ўвагі вучоных будуць і матэрыялы з архіва Аляксандра (Алі) Адамовіча, які ўяўляе сабой унікальны комплекс арабскаграфічных дакументаў на славянскіх мовах.

Чакаецца прэзентацыя выдання «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: аналітычныя і даведачна-інфармацыйныя матэрыялы», якая адбудзецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі. Затым размова пойдзе на зусім новую тэму – «IT у сучаснай моўнай прасторы: вопыт выкарыстання беларускай мовы пры рабоце з нейрасеткамі».

**19 лютага** ў Інстытуце мовазнаўства адбудзецца сустрэча са слухачамі і студэнтамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на тэму «Роля акадэмічнага мовазнаўства ў фарміраванні прафесійнай кампетэнцыі сучаснага кіраўніка».

У той жа дзень чакаецца творчая сустрэча акадэмічных вучоных-мовазнаўцаў з беларускімі пісьменнікамі, а таксама інтэлектуальнае спаборніцтва «Мова роднай зямлі» з удзелам студэнтаў факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

І гэта далёка не ўсё з запланаванага. Галоўнай падзеяй стане Рэспубліканская дыктоўка па беларускай мове, якая пройдзе **21 лютага** ў ЦНБ. Яна прымеркавана да 80-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.




Падрыхтаваў
Сяргей ДУБОВІК, «Навука»